...ьлёты пра- ...весьці пад- ...рыхтавана

...ко больш месяца, як надрукава... рашэньне Кастрычнікаўскага ...уму ЦК УсеКП(б) аб разгор... ...і савецкага гандлю і палеп... ...ні грамадзкага харчаваньня ...едзачы на некаторыя зрухі ў ...е кооперацыі—тэмпы разгорт... ...я савецкага гандлю і палеп... ...ня грамадзкага харчаваньня ...шчэ адстаюць ад запатраба... ...аў соцыялістычнага будаў... ...ва.

...мсамольскія організацыі яшчэ ...аз слаба ўдзельнічаюць у пе... ...бове кооперацыі.

...значаная ЦК УсеЛКСМ дэка... ...я організацыі комсамольскіх ...і пры ЗРК, магазынах, скла... ...сталоўках даўно мінавала, ад... ... радзе месц не закончана ор... ...цыйнае аформленьне ячэек. ...мольцы ЗРК, магазынаў, скла... ...ў сё яшчэ недастаткова змагаюц... ... іх узорную работу, за пера... ...к на гаспадарчы разрахунак, ...вядзеньне зьдзельшчыны, за ...лівыя, клапатлівыя адносіны ...бслугоўваньня насельніцтва. ...мізэрны зрухі ў наладжвань... ...амадзкага харчаваньня. Комса... ...кія ячэйкі сталовак яшчэ не ...альваюць работу за організа... ...ўзорнасьці сталовак. Сталоўкі ...ладзілі яшчэ самастойнай на... ...оўкі неабходных продуктаў на ...орных пачатках з колгасамі.

...павольнасьцю, маруднасьцю ў ...т... трэба рашуча пакончыць.

...дна пастановы бюро ЦК ЛКСМБ, ...ым месяцы усімі організацы... ...мі будуць праводзіцца масавыя ...ы комсамольцаў, моладзі, якія ...юць у магазынах, складах.

...рад зьлётамі будуць праведзе... ...эйды „ЛК“, юнкораў, рабо... ...ударнікаў для праверкі работы ...зьвеньняў кооперацыйнай сы... ...: як яны ажыцьцяўляюць ра... ...і партыі аб недапушчаньні ...аньня цэн, аб ліквідацыі пры... ...вага асортыменту, затавар... ...ня.

...алёгічна гэтым зьлётам неаб... ... організаваць і правесьці зьлё... ...ы комсамольцаў, беспартыйнай ...зі, занятых на працы у ста... ...х.

...гыя зьлёты будуць мець вялі... ...ае значэньне для павялічэньня ...у комсамольскай організацыі ў ...ртваньні савецкага гандлю і па... ...аньню грамадзкага харчаваньня.

...вецкі гандаль, грамадзкае хар... ...ньне ў соцыялістычным будаў... ...е не павінны быць вузкім ...ам.

...нінскі комсамол на фронце со... ...істычнага будаўніцтва, у ба... ...бе за прамфінплян, за органі... ...йна-гаспадарчае ўмацаваньне ...саў, пад кіраўніцтвам партыі ...ся вялікіх перамог. Вопыт ...ай барацьбы комсамольцаў за ...фінплян, за соцыялістычную ...струкцыю сельскай гаспадаркі ...ходна шырока выкарыстаць для ...будовы кооперацыі, для палеп... ...ня грамадзкага харчаваньня. ...адушныя, абыякавыя адносіны ...ерабудовы кооперацыі—не да ...у ленінскаму комсамолу.

...жны комсамолец прылаўку ЗРК, ...зыну складу павінен быць ...ве ўдарнікам, па справе зма... ...а за пераход на гаспадарчы ...ахунак, за ўвядзеньне зьдзель... ...ны, за ліквідацыю затаварвань... ...авінен на справе паказаць, як ...а адносіцца да насельніцтва. ...ліва вялікую ролю ў абслу... ...ньні насельніцтва могуць ады... ...аць комсамольцы сталовак, ...зынаў, нарыхтоўчых складаў. ...арвая работа—рашае посьпехі ...рабудове кооперацыі, у раз... ...ваньні савецкага гандлю, у ...шаньні грамадзкага харчавань... ...ня

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! 3 СЬНЕЖНЯ 1931 г. № 279 (1547)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Ударнымі брыгадамі—змагацца за лес

Зьмешчаны сёньня матар'ял з Крупак і Вузьдзенскага раёну яскрава гэта сьцьвярджае. Колгасы гэтых раёнаў ня ўжылі рашучых мер, каб выканаць умовы з леспрамгасамі на пастаўку рабочай і цяглавай сілы, і штучна затрымліваюць адыходніцтва.

Няўхільнае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і 6 умоў т. Сталіна аб перабудове мэтодаў працы і сыстэмы зарплаты, аб палепшаньні кіраўніцтва работай лясных вучасткаў і шырокім разгортваньні растлумачальнай і культмасавай працы сярод рабочых—вось асноўная ўмова, пры якой пляны загатовак лесу будуць з посьпехам выкананы.

Не замарожваць рабочай і цяглавай сілы

КРУПКІ. 20-е лістапада загатоўлена дроў 19,57 проц., а вывезена тольк 7,58 проц. пляну. Такі нізкі процант тлумачыцца толькі тым, што рад колгасаў не пераключыўся яшчэ на ўдарныя тэмпы ў загатоўк-х і вывазцы лесу, не скарыстаў цалкам свабодную цяглавую і рабочую сілу, а райколгасаюз ня даў колгасам патрэбных указаньняў.

Формальна заключыўшы ўмовы на пастаўку рабочай і цяглавай сілы, паасобныя колгасы ня выконваюць узятых на сябе абавязкаў. Колгас „Іскра“ (Трэяноўскі с-с) нават адмовіўся заключыць умову. Частка сваёй цяглавай і рабочай сілы колгас поўнасьцю не скарыстоўвае на гаспадарцы.

Партыйная і комсамольскія ячэйкі таксама бязьдзейнічаюць. Дырэктывы РК КП(б)Б і ЛКСМБ да гэтага часу не рэалізаваны. Цьвёрдае заданьне не даведзена да заможна-кулацкіх гаспадарак.

РК КП(б)Б і ЛКСМБ павінны рашучы ўдарыць па опортуністых. Трэба ў корані перабудаваць сыстэму зарплаты, на ўсіх відах работ больш выразна і шырока праводзіць індывідуальную, неабмежаваную прогрэсыўна-преміяльную зьдзельшчыну, зьвярнуць асаблівую ўвагу на брыгадныя мэтоды лесазаготовак, ліквідаваць абязьлічку ў прымацаваньні паасобных рабочых да мэханізмаў і коняй і нарэшце, прыняць самыя рашучыя меры на палепшаньню культбытавога абслугоўваньня рабочых.

Дора.

Умову—выканаць

Вузьдзенскі РК ЛКСМБ заключыў умову з Нёманскім леспрамгасам на 100 проц. выкананьне пляну лесанарыхтовак у 4-м заключным квартале 3-га, рашаючага году пяцігодкі. Гэтая умова разаслана комсамольскім ячэйкам, з конкрэтным указаньнем, які ўдзел павінна прыняць кожная ячэйка ў нарыхтоўках і вывазцы дроў і лесаматар'ялаў. Усё-ж, большасьць ячэек раёну не паклалі яе ў аснову ўсей барацьбы па выкананьню і перавыкананьню пляну лесанарыхтовак.

Да практычнай рэалізацыі складзенай умовы прыступілі толькі. Прысынкоўская ячэйка. Ячэйка высунула свой сустрэчны плян: выразаць 300 кубамэтраў лесу. Організавана брыгада лесарубаў, сыстэматычна наладжваюцца суботнікі для загатоўкі і вывазкі дроў. Разам з гэтым Прысынкоўская комсамольская ячэйка праводзіць шырокую растлумачальную працу сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў беднякоў і серадняков.

А. М. С.

Політыка францускага імпэрыялізму

Экономічны крызіс ва Францыі раз вінаецца прысьпешаным тэмпам

З-за цэлага раду прычын экономічны крызіс разьвіваўся ў Францыі павальней, чым ва ўсіх іншых капіталістычных краінах. Соцыял-фашысты і опортуністы наклалішчат сіл на распрацоўку тэорыі францускай „проспэрыці“, і ў гэтых адносінах найбольш стараньня праявілі нямецкія соцыял-дэмократы, якія падрыхтоўвалі поўную капітуляцыю Нямеччыны перад Францыяй.

Пабіта таксама „тэорыя“ аб тым, што Францыя пасадзіць ня толькі Эўропу, але з часам і Амэрыку на „паёк“. Зараз „Тан“ і нават францускія соцыялістыя ўжо пачынаюць адмаўляцца ад францускай „тэорыі“. Было-б бязглуздзьдзіцай адмаўляць, што на сусьветным грашовым рынку Францыя яшчэ займае моцныя позыцыі. У падвалах францускага банку ляжыць 67,5 мільярдаў франкаў золатам. У портфэлі францускага банку знаходзяцца вэксалі замежнай валюты на 13 мільярдаў франкаў.

Аднак, урэшце, экономічнае становішча вызначаецца становішчам у вытворчасьці. А ў гэтых адносінах крыюцца нядобрыя адзнакі, адзнакі набліжэньня крызісу.

Аграрны крызіс таксама абвастраецца. З прычыны дрэннага ўраджаю прыйдзецца завезьці 14 квінталаў пшаніцы.

Асабліва моцны крызіс адчувае Францыя ў галіне замежнага гандлю. Пасыў гандлёвага балянсу склаў за 10 месяцаў 31 г. 10 мільярдаў франкаў.

Француская буржуазія доўга ганарылася тым, што ў краіне няма беспрацоўных. Зараз яна гэтым ужо не ганарыцца. Урад нічым ня мог пярэчыць, калі т. **Дорыё на падставе офіцыйных зьвестак давёў, што лік беспрацоўных дасягае ў Францыі аднаго мільёна, а лік часткова беспрацоўных—3,5 мільёнаў чалавек.**

Буйныя банкруцтвы здбываюцца ўсё часьцей. Каб выратаваць банк нацыянальнага крэдыту, урад быў прымушаны асыгнаваць 1 мільярд франкаў. На біржы пануе пэсымізм. „Крызіс давер'я“ нагэтулькі моцны, што француская вёска і гарадзкая дробная буржуазія пахавала ў гаршкі каля 20 мільярдаў франкаў, зьменшыўшы на гэтую суму ўклады ў дзяржаўны банк. За мінулы бюджэтны год па офіцыйных зьвестках дэфіцыт роўен 2,6 мільярдаў руб.

Выбары набліжаюцца. Яны выклікаюць непакой політычных партый францускай буржуазіі, уключаючы і соцыял-фашыстых. Усе буржуазныя партыі спрабуюць свае позыцыі на выбарах. Але па асноўных пытаньнях замежнай політыкі францускага імпэрыялізму няма прынцыповых разыходжаньняў між рознымі партыямі францускай буржуазіі, уключаючы і соцыялістых. Гэтая аналічнасьць зьяўляецца падставай для усякіх плянаў аб стварэньні „нацыянальнага ўраду“ па ангельскаму ўзору. Аднак, соцыялістыя і радыкал-соцыялістыя пакуль лічаць за лепшае застацца ў „опозыцыі“.

Усе партыі францускага імпэрыялізму, уключаючы і соцыялістых імкнуцца адцягнуць увагу працоўных мас ад крызісу, беспрацоўя, зьніжэньня зарплаты, разбурэньня асноўных пластоў сялянства, ад крывавых войн, якія францускі імпэрыялізм вядзе у сваіх колёніях (Індокітай, Марокко). *Усе партыі* францускага імпэрыялізму імкнуцца адцягнуць увагу працоўных ад усё большага росту падаткаў, аграмадных ваенных выдаткаў і ад таго беспрэчнага факту, што Парыж стаў адным з важнейшых цэнтраў эўропэйскай рэакцыі і побач з Вашынгтонам абвяшчаецца організатарам і застрэльшчыкам новай вайны організатарам і натхніцелем усіх інтэрвэнцыяністскіх плянаў супроць СССР.

Француская партыя і рэволюцыйны профрух у асобе унітарнай конфэдэрацыі працы вядуць барацьбу супроць францускага імпэрыялізму. Нядаўныя выступленьні т. т. Кашэна, Дорыё і інш. у палаце сьведчаць аб тым, што францускія комуністы скарыстоўваюць парляманцкую трыбуну для выкрыцьця сапраўдных плянаў францускага імпэрыялізму.

Францускія комуністыя ведаюць, што барацьба рашаецца не ў парляманце, і што яе вынік залежыць ад мобілізацыі мас на клясавую барацьбу, ад зьдзейсьненьня пролетарскага адзінага фронту зьнізу, ад падрыхтоўкі і правядзеньня контрнаступу пролетарыяту пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі Францыі.

(Скарочаная перадавая „Праўды“).

Даёш комсамольскіх снайпэраў!

Падрыхтуем да гадавіны Чырвонай арміі—ударную шматмільённую колёну комсамольскіх першаклясных стралкоў



Баўманскія комсамольцы выступілі з пачынам: Організаваць да гадавіны Чырвонай арміі ўсесаюзны стралковы конкурс. Усім комсамольскім організацыям трэ' было адгукнуцца на гэты пачын: неадкладна разгарнуць масавую работу сярод комсамольцаў, рабочай моладзі па падрыхтоўцы да стралковага конкурсу і наогул па палепшаньню ўсёй работы па ваенізацыі. Аднак, за выключэньнем паасобных організацый, як Менская і Гомельская, ніхто не адгукнуўся на заклік баўманцаў.

Неадкладная наша задача: зараз-жа, на аснове соцыялістычнага спаборніцтва між ячэйкамі і вайсковымі гурткамі шырока разгарнуць падрыхтоўку да Усесаюзнага стралковага конкурсу, цесна ўвязаўшы яе з палепшаньнем ваенізацыі наогул і асабліва—работы вучэбна-вайсковых пунктаў, якія павінны стаць цэнтрам організацыі вайсковай работы комсамолу.

Палепшыць справу ваенізацыі ў колгасных ячэйках

У местачковых ячэйках (Старыя-Дарогі) справа ваенізацыі ў апошні час палепшылася. Комсамольцы навучаюцца ў вайсковых пунктах.

У комсамольскіх ячэйках колгасаў „Ю-ы Кастрычнік“, „Чырвоная Беларусь“ і інш. ніякіх гурткоў па вывучэньню вайсковай тэхнікі няма, бо ячэйкі колгсаў Стара-Дароскага раёну зусім недаацэньваюць ваенізацыю

Райком комсамолу слаба кіруе гэтай работай.

Васіль Сулімчык

Да стралковага конкурсу ня рыхтуюцца

Комсамольская організацыя Баўманскага раёну Масквы нядаўна выступіла з прапановай організаваць Усесаюзны стралковы конкурс. Гэты пачын мае выключнае значэньне, бо стралковая справа—важнейшая, цэнтральная задача ў галіне ваенізацыі комсамолу.

Стралковы конкурс паслужыць для яшчэ большага ўмацненьня вайсковай работы ў комсамоле, павысіць тэхніку стралка-комсамольца.

Аднак, Старасельская комсамольская організацыя (Віцебскі раён), у якой больш 80 членаў, не падхапіла гэты пачын, і нічога конкрэтнага для яго не зрабіла. А якраз ваенізацыя ў Старасельскім кол-ве КСМ пастаўлена зусім дрэнна. Ні вайсковага гуртка, ні адпаведнай літаратуры ў ячэйках ня знойдзеш.

Комсамольскі колектыў Старасельскага савету абавязан разгарнуць шырокую масавую работу для популярызацыі пачыну баўманскіх комсамольцаў. Організацыя спэцыяльных гурткоў па вывучэньню тэхнікі стральбы дасьць магчымасьць комсамольцам падрыхтавацца да ўдзелу ў стралковым конкурсе.

Рабфакавец Шукет.

Вучэбны вайсковы пункт—цэнтр работы па ваенізацыі

Пры фабрыцы „Сьцяг Індустрыялізацыі“ (Віцебск) ёсьць вучэбны вайсковы пункт. Ня гледзячы на тое, што на фабрыцы працуе каля 5 тысяч рабочых—у большасьці моладзь, наведваньне пункту зусім слабое.

Вучэбны пункт не стаў цэнтрам, дзе-б разгортвалася ўся работа па ваенізацыі. Абсталяваньне зусім слабое, вайсковай літаратуры мала. Комсамольская організацыя фабрыкі недаацаніла ролі, якую павінен адыграць вучэбны вайсковы пункт у справе наладжваньня ваенізацыі. Нязначная колькасьць комсамольцаў наведвае заняткі.

Комсамольская організацыя абавязана неадкладна дабіцца пералому ў рабоце вучэбна-вайсковага пункту.

Юнкор Фрэйдзон.

За сумесную работу з АСО!

Ваенізацыяй у нас займаюцца некалькі організацый як Асоавіяхэм, Чырвоны крыж і інш. У рабоце гэтых організацый павінна быць цесная ўвязка і адзіны плян.

У Парыцкім раёне гэтага якраз ня знойдзеш. Ваенізацыя пастаўлена зусім слаба. Ячэйкі АСО бязьдзейнічаюць, а райсавет і ня думае аб тым, каб ажывіць іх работу. Не адчуваецца сумеснай работы комсамольскай і авіяхэмаўскай організацый.

Комсамольская організацыя Парыцкага раёну абавязана ліквідаваць гэты прарыў, наладзіўшы сумесную, пляновую работу між організацый, зьвязаных са справай умацненьня абароназдольнасьці краіны.

Нар-к.

Напярэдадні пленуму ЦК ЛКСМБ

Калі РК прэтэндуе на чорную дошку...

ПАТРАБУЕМ РУШЫЦЬ КОМСАМОЛІЮ ЗА ЯКАСЬЦЬ НАВУЧАНЬНЯ

Сёньня мы зьмяшчаем матар'ялы аб стане політэхнізацыі ў школах Любаншчыны. Гэтыя матар'ялы—суровае абвінавачваньне комсамолії Любанскага раёну і ў першую чаргу яе раённага камітэту, які не забясьпечыў мобілізацыі мас комсамольцаў і ўсёй працоўнай моладзі на рэалізацыю пастановы партыі аб школе.

Факты, падаваемыя ў матар'ялах, павінны атрымаць тэрміновае і рашучае рэагаваньне.

Мы патрабуем неадкладнай і карэннай перабудовы шэфства Любанскай комсамолії над усеабучам. Шлях гэтай перабудовы: неадкладная пыкрорэгнутая прапрацоўка апошніх дырэктыў партыі аб сярэдняй і пачатковай школе, разгортваньне агляду—самаправеркі шэфства комсамоліі над усеабучам напярэдадні 4 пленуму ЦК ЛКСМБ.

Шляхам выкананьня гэтых умоў Любанская комсамолія зможа прысьці да пленуму ЦК ЛКСМБ з конкрэтнымі паказчыкамі рэалізацыі пастановы партыі аб школе, у прыватнасьці ў адносінах барацьбы за якасьць навучаньня, за якасьць політэхнізацыі.

Патрабуем таксама ад Любаньскага РК ЛКСМБ праз дэкаду выступіць на старонках „Чырвонай зьмены" і павядаміць комсамолію і чытачоў ЦО ЛКСМБ аб ужытых мерапрыемствах.

На варце... славеснай школы

Любань. Становішча політэхнізацыі школ прымушае біць трывогу. Барацьба за якасьць політэхнізацыі не пастаўлена у парадак дня. Пытаньне політэхнізацыі РК Працасьветы зусім не займаецца і лічыць гэта „не сваёй работай".

Школы не прымацаваны да колгасаў, прадпрыемстваў, усё яшчэ не заключаны дагаворы па політэхнізацыі.

Ячэй няма ніводнай школы у якой бы-б-ы праца̃ўся пакей, як першы крок да політэхнізацыі. Школы не набылі неабходныя для іх інструманты. Райасьвета і сельсаветы у гэтых адносінах школам нічым не дапамагаюць. У школах пануе славеснасьць і схолястыка.

Комсамолія, як шэф усеабучу не выконвае дырэктыў партыі аб політэхнізацыі. Патрабны энэргічныя меры. І ў першую чаргу гэта датычыць працаўнікоў інспэктарыя ту Нарасьветы і комсамоліі, як шэфа усеабучу. Грош цана будзе рапарту Любанскага РК ЛКСМБ да пленуму ЦК ЛКСМБ, калі ня будзе неадкладна пералому.

Юнкор „ЧЗ" Новік Янка.

У палоне безадказнасьці

Ужо больш 3-х месяцаў, як Любанская беларуская ШКМ распачала сваю работу. У выкананьне задач політэхнізацыі школа заключыла дагавор, які ў аснову сваёй работы кладзе задачу детальна вывучыць процэсы працы на кружмальным заводзе.

Школа, заключыўшы гэтакі дагавор, не ўзялася за яго практычнае ажыцьцяўленьне. Выкананьне дагавору зрываецца. Азнаямленьне вучняў з прадпрыемствам не наладжана.

Унутры самой ШКМ маецца найстрэлія, якая павінна служыць справе політэхнізацыі. Аднак, як ні дзіўна, вучні за ўвесь час свайго навучаньня на бачылі ні заводу, ні майстэрні.

Такім чынам, пастановы партыі аб барацьбе за політэхнізацыю Любанскай ШКМ злачынна ігнаруюцца. І ў першую чаргу адказнасьць за гэтыя безадказнасьці скажэньні прынцыпаў політэхнізацыі нясуць адміністрацыя школы і комсамольская ячэйка.

Брыгада „ЧЗ" Кашляк Рыгор і Рашчэня Алесь

Выраўняць фронт барацьбы

29-га лістапада ў клюбе Працасьветы адбыўся сход комсамольскага актыву г. Менску, які абгаварыў пытаньне аб становішчы і задачах рэалізацыі пастановы ЦК аб школе.

Выступіўшы з дакладам гарінспэктар т. Маслакоў, зазначае. Мы прыступілі да перагляду програм. Для працы ЦП Саюзу Працасьветы вылучыла лепшых метадыстых настаўнікаў.

—Наша задача завесьці пастанову ЦК аб школе да кожнага вучня і ягоны бацькоў, да кожнага рабочага на прадпрыемстве. Гэтай задачы некаторыя комсамольскія колектывы (Абутковая і „Кастрычнік") не выканалі.

Не гледзячы на тое, што перадаючы справы дагавароў школ з прадпрыемствамі патрэбна было закончыць да 7 лістапада, яшчэ і цяпер шэраг школ дагавароў з прадпрыемствамі не заключылі.

Комсамол недастатковую ўвагу аддаў падрыхтоўцы педагогічных кадраў. Патрэбна было даць на настаўніцкія курсы 25 комсамольцаў, Гарком ня даў ніводнага.

Далёка не скарыстоўваюцца ўнутраныя рэсурсы па механічнаму абсталяваньню пакояў пры школах. Мы апынуліся перад пагрозаю спыненьня ў школах гарачых сьнеданьняў. Прычына—дрэннае забясьпечаньне школ харчамі з боку МЦРК. У забясьпечаньні вучняў вопраткай, абуткам і харчамі бязьдзейнічае комсамольская арганізацыя Белкоопсаюзу. Кустпромсаюзу і Райспажыўсаюзу. Яны ня могуць насіць назвы шэфаў усеабучу—гаворыць т. Маслакоў.

—Мы адкрываем 5 вузорных школ Пакуль што адчынілі адну (25 школа імя Чэрвякова), але і для яе няма патрэбнага кадру настаўнікаў. У нас малая комсамольская праслойка сярод настаўнікаў.

З садакладам ад Гаркому ЛКСМБ выступіў т. Васкабойнікаў, які адзначыў, што комсамольскія колектывы нават буйнейшых прадпрыемстваў (завод імя Варашылава, цяга) нічога не зрабілі ў справе заключэньня дагавароў са школамі.

У спрэчках выказаліся Нісьневіч (індустрыяльны пэдтэхнікум), Катноў (Друкарня імя Сталіна). Салавейчык (29 школа), Тырнес (колектыў ЛКСМБ Рабпрос) і інш.

Сход прыняў пастанову, у якой адзначыўшы марудныя тэмпы рэалізацыі пастановы ЦК аб школе ў Менску і бязьдзейнасьць у рэалізацыі комсамоліі МЦРК і працасьветы, адабрае пастанову Гаркому ЛКСМБ аб арганізацыі конкурсу на лепшую школу. Сход лічыць неабходным склікаць агульна-гарадзкой політэхнічнай конфэрэнцыі і высылкі ў раён ударных комсамольскіх брыгад па праверцы рэалізацыі пастановы ЦК аб школе на вёсцы.

Кавалевіч

Двухмесячнік беларусізацыі

Агонь па супраціўленцах беларусізацыі

Двухмесячнік беларусізацыі павінен зьявіцца магутным сродкам узьняцьця баяздольнасьці кожнай ячэйкі, кожнага комсамольца ў барацьбе за ажыцьцяўленьне ленінскай нацполітыкі партыі. Барацьба ўпартае і пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне беларусізацыі—адно з важных зьвеньняў у агульным ланцугу барацьбы за ленінскую нацполітыку.

Таму надвычайна вялізарнае значэньне набывае 2-хмесячнік беларусізацыі, як абвешчаны пленумам ЦК ЛКСМБ з 1-га лістапада. Комсамолія заводу „Ноўка", „Комбінат" і Віцебскага політэхнікуму няўцаніўшы гэтага вялізарнага значэньня, не разгарнулі двухмесячніку. Гэтым комсамольскім колектывам двухмесячнік беларусізацыі трэба выкарыстаць для ўзьняцьця баяздольнасьці кожнай ячэйкі, кожнага комсамольца. Трэба неадкладна популярызаваць, вывучаць і рашуча змагацца за ўпартае ажыцьцяўленьне беларусізацыі, супроць вялікадзяржаўнага шовінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, беларускага контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмократызму і шовінізмаў іншых колераў.

Бюрократызм апанаваў беларусізацыю

(Паўторны сыгнал заводу „Ноўка")

З часу зalgалашэньня двухмесячніка беларусізацыі прайшло больш месяца але ніякага зруху ў правядзеньні беларусізацыі на шклозаводзе „Ноўка" ўсё яшчэ няма. Організацыі шклозаводу сыгналаў „Зьвязды" і „Чырвонай зьмены" аб ганебным ажыцьцяўленьні задач беларусізацыі не скарысталі для ўзьняцьця беларусізацыі на вышэйшую ступень. Факты вялікадзяржаўнага шовінізму і антысэмітызму, аб якіх сыгналізаваў друк, засталіся па-за ўвагай партыйнага і комсамольскага колектываў заводу. Адміністрацыя заводу абмяжавалася формальным рэагаваньнем на гэтыя сыгналы.

За подпісам дырэктара Касьперовіча выдадзены загад № 273 у якім гаворыцца: „загад № 247 § 3 аб тым, каб усе служачыя заводу перайшлі на белмову—апошнімі ня выкананы. А таму прапаную ўсім служачым у канторы, заводу усім дзесятнікам, заг. паасобных цэхаў, інжынэраў, тэхнарукаў, усім заг. складаў і астатнім адміністратарам у апошні раз весьці ўсю перапіску выключна на белмаве".

Вось узор фармалізму і бюрократызму. Замест організацыі гурткоў па вывучэньню белмовы, экономікі і культуры БССР, замест разгортваньня дабраахвотнага ўдарніцкага рабочага руху па аўладаньню задач беларусізацыі, на заводзе займаюцца адмініставаньнем. Пры чым—справу беларусізацыі зводзяць толькі к таму каб „весьці ўсю перапіску выключна на белмове", чым злачынна скажаюць дырэктывы партыі аб ажыцьцяўленьні беларусізацыі.

У выніку гэтых злачынных скажэньняў у нетрах габінэтаў, у канторы заводу, больніцы, сталоўкі і інш. панавала русацяпства.

Комсамольскі колектыў не займаецца пытаньнямі ажыцьцяўленьня беларусізацыі. Больш таго, да комсамольцаў, якія ігнаруюць белмову ніякіх захадаў ня ўжываецца.

Сярод рабочых не разгорнута ніякай работы па ажыцьцяўленьню беларусізацыі.

РК КП(б)Б і ЛКСМБ павінны зацікавіцца станам беларусізацыі на шклозаводзе „Ноўка", ігноруючых задачы беларусізацыі, трэба прыцягнуць да адказнасьці.

Брыгадзір „ЧЗ" Канончык Я.

Ціш ды гладзь...

Задачы ажыцьцяўленьня беларусізацыі у Віцебскім політэхнікуме ажыцьцяўляюцца дрэнна. Шэраг пастаноў, плянаў, рэзалюцый якія прымаюцца у тэхнікуме і па-за ім не атрымліваюць патрэбнага ажыцьцяўленьня колектывам тэхнікуму. Комсамолія не пераключыла сваю работу на беларускую мову. Цэлы рад комсамольцаў не ўжывае беларускай мовы, конспэкты складае на расійскай мове, не жадае працаваць на беларускіх падручніках.

У тэхнікуме заданьні па беларускай мове рыхтуюцца дрэнна, здаюцца ня у тэрмін. У гэтым годзе чамусьці лік гадзін па белмове у програме зьменшаны больш чым у два разы.

Пастаноўкі, мастацкія вечары праводзяцца на расійскай мове. Бібліотэка налічвае зусім мізэрную колькасьць беларускай пролетарскай літаратуры. Ухвалена організаваць беларускія гурткі па вывучэньню беларускай мовы. але да гэтага часу праца іх не распачата.

Комсамольскі колектыў пакінуў па-за ўвагай задачы разгортваньня 2-х месячніку беларусізацыі.

Комбінатаўцы, выходзьце ў бой

Комсамолія заводу „Комбінат" (Барысаў) не разгарнула работы па ажыцьцяўленьню задач 2-х месячніка беларусізацыі

На заводзе справа з беларусізацыяй абстаіць кепска. Ніякіх мерапрыемстваў па аўладаньню мовай рабочымі не праводзіцца. Комсамолія не распрацавала мерапрыемстваў па выкананьні задач беларусізацыі.

Л Гарэцкі

„Чырвоная зьмена" ў сваімі спэцыяльным нумары ад 14-га лістапада своечасова і зусім правільна ставіць пытаньне аб неабходнасьці ўдзяліць вялікую увагу разьвіцьцю прамысловасьці па пераапрацоўцы садовіны, гародніны і ягад, якімі багата БССР.

Пастаноўка гэтага пытаньня асабліва важна зараз, калі пачынаецца складаньне плянаў другой пяцігодкі, і мы павінны ў гэтых плянах улічыць усё большы рост патрабаваньняў працоўнага насельніцтва.

Пляніраваньне другой пяцігодкі атрымаўшы моцны грунт у поўным эграмаджаньні сельскай гаспадаркі, будзе перш за ўсё характарызавацца ў галіне, якая нас цікавіць, значным ростам садагародніных насаджэньняў і буйным ростам пасеўнай плошчы пад гародніну.

Пладанашэньне дрэў—яблык, груш і іншых семечкавых—пачынаецца праз 8-10 год пасьля пасадкі, дык прырост продукцыі пладоў будзе ня так ужо вялікі.

Затое ягаднікі за гэты час могуць даць нячуваны прырост продукцыі. Па намётках Наркомзему яна павінна раўняцца 170 тысячам тон. Зразумела, што і збор гародніны магчыма ў бліжэйшы час у некалькі разоў павялічыць.

Неабходна скліканьне ўсебеларускай нарады па консэрвах

Я. Залескі.

(Старшыня камісіі па складаньню пяцігадовага пляну кансэрвнай прамысловасьці)

Пляды, ягады і гародніну, зразумела, лепш за ўсё спажываць у свежым выглядзе. Пагэтаму перш за ўсё неабходна падумаць аб лепшых мэтодах захоўваньня іх. Важнейшае месца па захоўваньню пладоў і гародніны павінны заняць халадзільнікі, прыстасаваньне якіх стане адной з задач другой пяцігодкі.

Аднак, паколькі час захоўваньня пладоў і гародніны досыць абмежаваны, дык задача консэрваваньня зьяўляецца важнейшай для ўсёй народнай гаспадаркі. Пры пасьпяховым вырашэньні гэтай задачы мы даб'ёмся роўнамернага скарыстаньня як садовіны, так і гародніны на працягу ўсяго году.

У сучасны момант у БССР пакуль што вельмі мала прадпрыемстваў, якія перарабляюць і, значыцца, консэрвуюць садовіну, гародніну і ягады. Мармэлядныя фабрыкі ў Бабруйску і Слуцку, цеставарачныя цэхі кондытарскіх фабрык у Менску, Гомелі і Нароўлі, садовінны і сокавы завод у Воршы—вось насюнак амаль усіх буйнейшых прадпрыемстваў гэтай галіны ў БССР.

Зараз у Магілёве будуецца першы у БССР гародніна-сушыльны механізаваны завод. Зусім адсутнічае консэрвная прамысловасьць сада-гародніны.

БССР да гэтага часу вывозіла ў іншыя рэспублікі Саюзу садовіну, ягады і гародніну ў сьвежым выглядзе.

У бліжэйшыя гады, калі ў найбольш буйных раёнах Саюзу разгорнецца значная плошча пад садамі і гародамі, Беларусі прыйдзецца пераключыцца ў значнай меры на пераапрацоўку таварных лішкаў сыравіны на консэрвы, якія лепш можна будзе перавозіць у паўночныя часткі Саюзу, а таксама і за межы.

Узбуйненьне гарадоў Савецкага Саюзу, разгортваньне торфа і лесараспрацовак выклікаюць патрэбу у выпуску баначных консэрваў. Мэдычныя і дыэтычныя ўстановы безумоўна патрабуюць значнай колькасьці высокакаштоўных пладасокаў і концэнтратаў.

Таксама рост культурнасьці насельніцтва вядзе да выцясьненьня гарэлкі ягадным віном і сітро.

Наогул павышэньне матар'яльнага узроўню працоўных выклікае значны попыт на садовіну, ягады і гародніну.

Задавальненьне гэтага попыту патрабуе шпаркага разьвіцьця і будаўніцтва квасільных і засолачных пунктаў, хавальнікаў, мармалядных фабрык, пладовінных і сокавых заводаў, заводаў па сушцы садовіны і гародніны, мясарасьлінных консэрваў, пунктаў па сульфітацыі (консэрваваньню) ягад і г. д.

Усю працу па новаму будаўніцтву, па ўнясеньню плянавасьці ў гэту галіну народнай гаспадаркі па мобілізацыі ўвагі шырокіх мас працоўных: азнаямленьне з дасягненьнямі іншых савецкіх рэспублік у гэтай галіне—усё гэта яшчэ трэба організаваць.

Таму, на мой погляд, зусім правільнай зьяўляецца думка аб скліканьні ўсебеларускай нарады на пытаньнях разьвіцьця пладова-гароднай консэрвнай прамысловасьці і організацыі яе сыравіннай базы.

Комсамольскай організацыі БССР і газэце „Чырвоная Зьмена" неабходна узяць ініцыятыву па скліканьню данай нарады, утварыўшы зараз-жа організацыйны камітэт, які павінен будзе знайсьці сродкі для правядзеньня нарады, адначасова вылучыўшы зараз-жа дакладчыкаў па галоўных пытаньнях.

Лепшым месцам для скліканьня нарады будуць Горкі, бо там за апошнія гады шмат чаго было зроблена новага ў Сельска-гаспадарчай акадэміі па вывучэньню консэрвных уласьцівасьцяй беларускіх расьлін і па вопытнай выпрацоўцы розных садовых, ягадных і гародных консэрваў.

Таксама лепшым часам для скліканьня нарады будзе канец студзеня, альбо пачатак лютага 193... году, калі асноўнымі організацыямі Наркомснабу і Наркомзему будуць распрацаваны першапачатковыя варыянты пяцігадовага пляну разьвіцьця консэрвнай прамысловасьці.

„Чырвонай Зьмене" неабходна у зьвязку з падрыхтоўкай да гэтай нарады, сыстэматычна зьмяшчаць на сваіх старонках матар'ялы аб перспэктывах разгортваньня садагароднае справы, адначасова асьвятляючы задачы, што стаяць перад нарадай.

Адтэрміноўкі нецярпімы

Хутчэй скончыць будаўніцтва і комплектаваньне сьвінарнікаў і кароўнікаў

Нарадзіўся і расьце буйнейшы сьвінасаўгас

У 45 кілёмэтрах ад Гомеля, у Веткаўскім раёне, раскінуўся адзін з буйнейшых гігантаў мясной прамысловасьці—сьвінасаўгас імя Бохера.

Саўгас толькі з вясны 1931 году пачаў сваю працу на 9000 гектарах зямлі, якімі ахоплена тэрыторыя Жалезьнякоўскага, Акаўскага, Рэчкаўскага, Хізаваўскага і Ухаўскага сельсаветаў.

Фабрыка мяса нарадзілася ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, пры дрэннай якасьці глебы, адсутнасьці належных кадраў. Ня гледзячы на ўсё гэта, саўгас за 1931 год дабіўся буйнейшых посьпехаў.

Аслабавіўшыся ад опортуністычнага кіраўніцтва, саўгас, на чале з дырэктарам—тав. Лысенка, за апошнія два кварталы скончыў на 8. проц. будаўніцтва і ў асноўным выканаў і перавыканаў заданьне па ўкомплектаваньню. Пабудавана стайня на 60 коняй і два сьвінарнікі для сьвінаматак. К 15-му сьнежня будуць закончаны яшчэ два сьвінарнікі. Тры адкормачнікі на 280 галоў кожны ўжо гатовы.

Разам з будаўніцтвам ішла барацьба за ўкомплектаваньне будынкаў. Гадовы плян па комплектаваньне 400 сьвінаматак саўгас поўнасьцю выканаў. На 239 проц. выканана заданьне па ўкомплектаваньню саўгасу каровамі.

1932 год павінен зьмяніць твар саўгасу. Згодна пляну Белканторы „Сьвінавод", саўгас павінен паставіць у будучым годзе 12.285 сьвінаматак. Рабочы колектыў, абгаварыўшы гэты плян, даў сустрэчны на 3000 галоў. Такім чынам, у 1932 годзе сьвінарнікі саўгасу павінны мець 15 285 галоў сьвіней.

У 1932 годзе ў саўгасе будзе 3 трактароў, 6 аўтомашын і 2 маторныя лодкі. Колькасьць рабочай сілы ад 585 чал. у першым квартале павінна дайсьці да 1057 ч. у 4-м квартале. Адных трактарыстых патрабуецца каля 130 чал.

Разам з саўгасам нарадзілася і комсамольская ячэйка, якая зараз налічвае каля 30 чал.

Ячэйка павінна была адыграць вялікую ролю ў будаўніцтве буйнейшай савецкай гаспадаркі. Аднак, з-за опортуністычнага кіраўніцтва былога сэкратара ячэйкі—Гапеева, доўгі час стаяла ў баку. Гапееў на агульным сходзе ячэйкі быў выключан з комсамолу.

З прыходам новага кіраўніцтва, ячэйка ўключылася ў жыцьцё саўгасу. Комсамольцы-будаўнікі ўзялі на сябе абавязак скончыць датэрмінова, к 1-му сьнежня сьвінарнікі і выклікалі на соцспаборніцтва іншыя брыгады будаўнікоў. Комсамольцы Яўпееў і Кісельнікаў змагаюцца супроць рвацкіх імкненьняў некаторай часткі рабочых і заняліся эканоміяй будматар'ялаў.

Комсамольцы Саўчанка і кандыдат партыі т. Самусёва, заняліся пытаньнем догляду і корму сьвіней.

Перад комсамольскай ячэйкай саўгасу стаяць яшчэ вельмі адказныя задачы.

Шмат яшчэ нераўнадаецца корму санітарныя умовы ў сьвінарніках патрабуюць большай уважлівасьці ад комсамольцаў і рабочых сьвінарнікаў, вялікі процант адыходу сьвіней (каля 19 проц.)—усё гэта як найхутчэй трэба выправіць.

Комсамольская організацыя Веткаўскага раёну павінна заняцца падрыхтоўкаю кадраў для будучай мясной фабрыкі. РК ЛКСМБ неабходна правесьці мобілізацыю комсамольцаў у сьвінагігант.

Х.



Абязьлічка губіць жывёлу

У Сакалішчанскім сельсавеце Расонскага раёну організаваны дзьве таварныя фэрмы, адна малочная і адна сьвінаводчая. Але у апошніх пануе поўная абязьлічка у галіне догляду за жывёлай. У колгасе „Чырвоныя горкі" адыход парасят набывае вялікія памеры каля 30 проц. Плян комплектаваньня фэрм выканан толькі на 65 проц.

Праўленьне колгасаў „Чырвоная Сакалішча" і „Чырвоныя горкі" не зьвяртаюць ніякай увагі на разьвіцьцё жывёлагадоўлі.

Комсамольскія ячэйкі гэтых 2 колгасаў павінны паставіць на парадак дня пытаньне аб разгортваньні соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

Я.—Шкі.

Хутчэй скончыць будаўніцтва

Адозва СНК Саюзу аб разгортваньні сэпжывёлагадоўлі не распрацавалася у колгасе „Прогрэс" (Лэскі сельсавет, Слуцкага раёну). Колгасьнікі, і ў тым ліку комсамольцы, нічога ня ведаюць аб ёй. Ня дзіва, што будаўніцтва і комплектаваньне сьвінаводчай таварнай фэрмы у колгасе зрываецца. Сьвінарнік на 50 сьвінаматак з вясны яшчэ ня скончан.

Сьвіньні стаяць у цесных і халодных хлявох, дрэнна даглядаюцца. Зьдзельна-прэміяльная аплата працы ў колгасе ня ўведзена.

Колгас павінен чым найхутчэй дабіцца пералому. Комсамольская ячэйка павінна кінуць усе свае сілы на дабудову сьвінарнікаў і ўкомплектаваньне.

Брыгада „ЧЗ": Тряяноўскі, Бранавец, Статкевіч.

Варашылаўцы патрабуюць

Устанавіць опэрацыйны кантроль за адпраўкай жалеза

Комсамольцам, плянава-опэрацыйных груп заводу „Сартапо" (Донбас).

Дарагія таварышы!

Комсамольская ячэйка і плянава-опэрацыйная група кацельнага цэху заводу імя Варашылава зварочваецца да вас з наступным запатрабаваньнем: Ваш завод забясьпечвае завод Варашылава і ў асаблівасьці кацельны цэх жалезам. Аднак, ваша заводакіраўніцтва з месяца ў месяц не дасылае вызначанага нам па пляну жалеза.

Наш завод, які зьяўляецца адным з першых у Беларусі, у асаблівасьці па ўдзелу ў радзе кампаній, ня выканаў прамфінпляну за 3-ці квартал на 20 проц.

Мы ўзялі на сябе абавязак у апошнім квартале 3-га рашаючага ня толькі выканаць плян, але ліквідаваць прарыў мінулага кварталу з такім разьлікам, каб мы мелі магчымасьць рапартаваць ураду аб выкананьні адным з буйнейшых заводаў плянаў 3-га рашаючага.

Кацельны цэх у апошнія месяцы выконвае прамфінплян на 80-85 проц. з-за недахопу матар'ялу, які пастаўляе ваш завод.

Мы павінны выканаць свой плян, а гэта значна залежыць ад вас.

Мы зварочваемся да вас, таварышы комсамольцы і плянавікі,—організуйце работу вашага заводу такім чынам, каб поўнасьцю забясьпечыць нас сыравінай, устанавеце опэрацыйны кантроль за сваячасовай адпраўкай жалеза нашаму заводу.

Памятайце, што вы зьяўляецеся адзіным пастаўнікам сыравіны для нас.

Да канца году засталося менш месяцу. Не чакайце ні хвіліны, форсуйце тэмпы. Дапамажэце нам выканаць свой прамфінплян.

Сэкратар ячэйкі ЛКСМБ Бэрнштэйн
Заг. вытворч. сэктару ячэйкі Дано.
Кіраўнік плянава-опэрацыйнай групы Эстэркін.

Конкурс нізавога друку

Няхай будзе шэфам колгаснай штодзёнкі—штодзёнка ўдарнага цэху

За гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, за поўнае выкананьне пляну загатовак

Абвешчаны „Праўдай" конкурс нізавога друку па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню колгасаў мае вялікае палітычнае значэньне.

Кожная комсамольская ячэйка, колектыў КСМ павінен па прыкладу райорганізацыі Койданаўшчыны разгарнуць работу вакол конкурсу, каб забясьпечыць бесьперабойны выхад шматтыражак, насьценгазэт, штодзёнак для асьвятленьня чарговых задач дня і опэрац. кіраўн. юнкоруху. Кожная маладзёжная старонка фабрычна-заводзкай шматтыражкі павінна па-сапраўднаму ажыцьцявіць шэфства над насьценгазэтамі і штодзёнкамі саўгасаў і колгасаў для перадачы ім лепшага вопыту работы сваёй вытворчасьці, што дапаможа колгасу ў арганізацыйным яго ўмацаваньні.

Забясьпечыць рэгулярны выхад маладзёжнай старонкі

Работа маладзёжных старонак у друкарні імя Сталіна яшчэ не пастаўлена на належную вышыню. Шматтыражка пры друкарні выходзіць штодзённа, але маладзёжная старонка нерэгулярна, 6 насьценгазэт выдаюцца пры кожным цэху, але маладзёжная старонка нерэгулярна. Комсамольскі колектыў кіруе маладзёжнай старонкай праз комсамольскіх юнкораў у рэдколегіі. Бюро колектыву КСМ 2 разы ў 3 месяцы заслухоўвае справаздачу рэдактара маладзёжнай старонкі.

Маладзёжная старонка вядзе сталы вучот юнкораў і кіруе іх працай праводзячы раз у месяц нарады. У аснову работы юнкоры паклалі брыгадны мэтод. Старонка правяла адзін рэйд з юнкорамі, асьвятлілі ход падрыхтоўкі перавыбараў ФЗМК, а таксама організавала работу па павышэньню роду КСМ. Рэдколегія старонкі на сходах юнкораў распрацавала пастанову зьезду рабсельваенкораў. Комсамольскі колектыў павінен зрабіць усё магчымае, каб забясьпечыць рэгулярны выхад маладзёжнай старонкі, а таксама маладзёжных куткоў пры насьценгазэтах; за ўсю шыр разгарнуць шэфства над шматтыражкамі і маладзёжнымі старонкамі саўгасаў і колгасаў прыгараднай паласы, на лепшую працу па організацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню колгасаў.

Брыгадзір „Ч. З." А. Фэдаранчык.

Уключаемся ў конкурс

У зьвязку з бесперапыннай вытворчай практыкай, рэдколегія газэты „Кузьня кадраў" Хэміка-тэхнолёгічнага тэхнікуму у вельмі часта мяняецца ў сваім складзе, што зрывае нормальны выпуск газэты.

З мэтай практычна рэалізаваць мерапрыемствы па конкурсу і пастановы другога ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў, зараз у тэхнікуме перайшлі на новы мэтод выпуску газэт—штодзёнак. Штодзёнкі выпускаюцца на кожным курсе і ў кожным аддзяленьні. Штодзёнкі зараз разгарнулі падрыхтоўку да перавыбараў комсамольскай організацыі комбінату, змагаюцца за правядзеньне ў жыцьцё новых мэтодаў акадэмпрацы, за лепшую акадэмбрыгаду. Кожная штодзёнка мае сваю тройку і адказнага за нормальны выхад газэты. Адзін з тройкі ўваходзіць у рэдколегію агульна-тэхнікумаўскай насьценгазэты.

Трэба адзначыць, што агульна-тэхнікумаўская насьценгазэта ні разу ня ставіла пытаньне аб практычнай рэалізацыі сталінскага паходу. Некаторыя студэнты нават ня ведаюць, што гэта за паход.

Комсамольскаму колектыву неабходна практычна дапамагчы нізавым газэтам саўгасаў і колгасаў, высылаючы тулы брыгады. Трэба разгарнуць работу вакол сталінскага паходу—і давесьці яго да кожнай акадэмбрыгады.

Кутман

Пералом дасягнуты—падцягнуць адстаючых

У 2-м і 3-м кварталах ашчадкасы Вушацкага раёну ня выканалі пляну па ўцягненьню фізычных укладаў. Тлумачыцца гэта тым, што апарат ашчадкасы не правёў работы сярод шырокіх мас насельніцтва па мобілізацыі сродкаў, не ўлічвалася рашучае змаганьне за выкананьне квартальных заданьняў сярод працоўных ашчадкас.

Зусім іншае ў 4-м квартале. План па фізычных укладах выкананы на 132,2 проц. Узорную работу паказваюць ашчадкасы: Чарсьцьвядская, якая выканала плян 4-га кварталу на 517 проц., Вяліка-Далецкая—на 282 проц., Кубліцкая—на 104 проц і Гарадзецкая на 74,4 проц.

Ёсьць, аднак, і такія ашчадкасы, у якіх назіраецца вялізарны адліў укладаў. Так, ашчадкаса № 14 пры Вушацкім паштовым аддзяленьні Глыбачанская каса маюць адліву 314 р., а ў Усайскай ашчадкасе толькі адзін укладчык, і той—паштовы агент.

14 лістапада ў раёне была склікана нарада ўсіх працаўнікоў ашчадкас. Нарада абгаварыла выклік Лепельскай ашчадкасы. Выклік прыняты, і заключана ўмова на спаборніцтва з ашчадкасамі Лепельшчыны па ўцягваньню фізычных укладаў. Адначасова нарада высунула сустрэчны плян мобілізацыі сродкаў на суму 15 тыс. руб., супроць вызначанай лічбы ў 9 тысяч руб.

Каб лепш выканаць узятыя на сябе абавязацельствы, ашчадкасы Вушацкага раёну разгарнулі між сабою соцспаборніцтва. Вяліка-Далецкая ашчадкаса выклікала на соцспаборніцтва Кубліцкую Чарсьцьвядская—Глыбачанскую, Гарадзецкая-Усайскую.

За разгортваньне вялікай работы па мобілізацыі сродкаў, работніка Вушацкай ашчадкасы № 77—т. Азевіча Наркомфін БССР прэміяваў 100 рублямі.

К. Кароль.

Правал чарговай провокацыі японскага імпэрыялізму

БЭЙПІН. 1. Харбінская газэта „Харбінскі час“ нядаўна паведамляла аб тым, што нібыта ў Харбіне з удзелам „агента ДПУ“ падрыхтоўваліся налёты і выбухі ў японскіх установах Харбіну. Па паведамленьню газэты, у зьвязку з раскрыцьцём гэтых плянаў арыштаваны Флемэнт і Сакалоўскі.

Шляхам сэнсацыйных паведамленьняў падобнага роду газэта спрабавала адцягнуць увагу грамадзкасьці ад провокацыйных плянаў, задуманых некаторымі японскімі вайскоўцамі разам з белагвардзейцамі ў адносінах К-У чы? і савецкіх установ. Выкрыцьцё гэтых замыслаў савецкаю прэсай нанесла агранадны ўдар провокатарскім японскім і белагвардзейскімі элементам.

Зараз канчаткова высьветлілася, што ўся гэтая гісторыя з „падрыхтоўкай выбуху ў японскіх установах“ уяўляе праваленую японскую інсцэніроўку. Кітайскія ўлады ў Харбіне, арыштаваўшы Флемэнга і Сакалоўскага, высьветлілі, што адзін з іх зьяўляецца латвійскім падданым, а другі эмігрантам які прыняў кітайскае падданства.

У друку зьявіўся ліст Сакалоўскага, у якім ён прапануе японскай ваеннай місіі свае паслугі, у прыватнасьці Сакалоўскі выразіў сваю гатоўнасьць пайсьці на службу да новых кітайскіх груп. Сакалоўскаму і Флемэнгу было дадзена заданьне падрыхтаваць плян уяўных выбухаў японскіх установ.

Гэты плян павінен быў быць „выкрыты“ на пярэдадні тэрміну, вызначанага для яго ўяўнага выкананьня. Задуманая інсцэніроўка праваліласся з-за таго, што кітайскі ўрад аддае асаблівую ўвагу ахове японскіх інтарэсаў і рэзыдэнтаў установ.

Даведаўшыся аб наяўнасьці гэтых плянаў, кітайскія ўлады прынялі належныя захады і арыштавалі Флемэнга і Сакалоўскага, такім чынам агаласіўшы гэтую справу.

Прысуд над лідэрамі компартыі

ТОРОНТО Газэта „Канадкі гудок“. У перадавіцы паведамляе што ў пятніцу 13 лістапада скончыўся суд над лідэрамі компартыі, над комуністычнай партыяй і над правам рабочых Канады свабодна выказваць свае перакананьні.

„Бесстаронны“ суд над таварышамі т. Бакам. Сэм Карам, А. Гілам, Том Юнам, Т. Касікам, І. Байчуком, М. Брусам і М. Паповічам скончыўся к 1 гадзіне дня вынясеньнем судзьдзёю Врайтам цяжкага прысуду ў 5 год зьняволеньня. Компартыя Канады абвешчана незаконнай. як організацыя, мэтай якое зьяўляецца гвалтоўнае нізрынуцьце існуючага ладу (Курсіў усюды наш рэд)

Гістарычны процэс, які цягнуўся 12 дзён і прыцягнуў увагу ўсяго сьвету, як першае выступленьне канадзкай буржуазіі на адкрыты шлях фашызма і гвалту над правам рабочых організоўвацца і свабодна выказваць сваю думку, паказаў што капіталізм, у жаданьні ўтрымацца на сваім хісткім троне, ня спыняецца ні перад якімі захадамі для дасягненьні сваёй мэты.



На здымку (зьлева направа): т. Паповіч, Томюн, Гіл, Байчук, Голінскі, Сэм Кар, і т. Бак (сакратар компартыі)

Дэмонстрацыі па ўсёй краіне на абарону компартыі (Канада)

ТЫМІС—Шахцёры Тымінса разам з беспрацоўнымі гораду дэманстравалі ў знак протэсту супроць 98 артыкулу закону, які ставіць рабочыя організацыі на стан нелегальных. Была вынесена рэзолюцыя, якая патрабуе вызваліць арыштаваных комуністых.

ФЭРНІ. Савет беспрацоўных склікаў мітынг у знак протэсту супроць забароны комуністычнай партыі. На мітынгу выступаў т. Міньер. Рэзолюцыя протэсту была выслана у Оттаву.

ПОРТ-АРТУР. Масы рабочых вышлі на вуліцу з запатрабаваньнем вызваліць лідараў компартыі. Паліцыя накіравала на дэмонстрантаў аўтомобілі, зьбіла і арыштавала некалькіх рабочых, абвінавачваўшы іх у валацужніцтве і ўдзеле ў незаконнай дэмонстрацыі. Таварышы Колінюк і Камчук прысуджаны да турэмнага зьняволеньня на 5 месяцаў кожны і штрафу ў 100 доляраў.

ТОРОНТО. Тысячы рабочых, сабраўшыся ў гарадзкога кіраўніцтва, былі сустрэнуты атрадамі паліцыі, якая разьбіла дэмонстрацыю. Рабочыя былі адціснуты да вуліцы Сого. Натоўп рабочых з рэволюцыйнымі песьнямі разышоўся па хатах.

(З газэты расійскіх рабочых Канады—„Канадский гудок“ ад 16 лістапада 1931 г. рэд).

Компартыі Японіі і Кітаю выкрываюць перад працоўнымі антысавецкую дзейнасьць імпэрыялістых

БЭРЛІН. 1. Тут з вялікім спазьненьнем атрымана сумесная адозва компартыі Японіі і Кітаю ў зьвязку з захопам Манчжурыі японскім імпэрыялізмам. „Японскі імпэрыялізм,—гаворыцца ў адозьве,—пры дапамозе ваеннага гвалту заняў Манчжурыю. Гэта азначае, што японскі імпэрыялізм зрабіў Манчжурыю сваёй колёніяй.

Такім чынам ён хоча яшчэ больш жорстка прыгнетаць народныя масы Кітаю, а з другога боку ён рыхтуецца да нападу на краіну будаўніцтва соцыялізму—СССР“.

Далей адозва выкрывае здрадніцкую ролю Гоміндану, які фактычна дапамагае японскаму імпэрыялізму.

По той бок мяжы

Падпісаньне пратаколу польскім і нямецкім урадамі

ВАРШАВА. 1. Прадстаўнікамі польскага і нямецкага ўрадаў падпісаны пратакол, які вырашае рад эканомічных і фінансавых пытаньняў, закранутых у нямецка-польскіх перагаворах, што адбыліся ў кастрычніку і лістападзе.

У адказ на манэўры прадпрыемцаў—паўторная забастоўка ў Лодзінскім раёне

ВАРШАВА. 1. У Шлесэраўскай мануфактуры (Лодзінскі раён) выбухнула паўторная забастоўка 1800 рабочых у знак протэсту супроць абвяшчэньня фабрычнай адміністрацыяй аб звальненьні часткі рабочых.

Нядаўна праведзеная шлесэраўскімі рабочымі першая забастоўка скончылася, як вядома, перамогай рабочых, якія прымусілі прадпрыемцаў прыняць назад звольненых. Аднак, уступка прадпрыемцаў аказалася часовай, і яны пасьля ліквідацыі забастоўкі спрабавалі ўсё-ж правесьці звальненьне.

Компартыя Нямеччыны выкрывае хлусьню с-д правадыроў

БЭРЛІН. 1. Компартыя Нямеччыны праводзіць кампанію па растлумачэньню шырокім масам хлусьлівых манэўраў соцыял-дэмократычных правадыроў, якія маюць на мэце перашкодзіць стварэньню рэволюцыйнага антыфашысцкага фронту знізу.

На працягу ўсяго гэтага тыдню адбудуцца масавыя мітынгі ў Бэрліне і іншых буйных рабочых цэнтрах. У адной з буйнейшых заль Бэрліну адбыўся масавы сход на тэму „за забастоўку—расстрэл“. Пасьля сходу 11 рабочых абвясьцілі аб сваім уступленьні ў компартыю, і ў тым ліку член фашысцкага саюзу нямецкіх рабочых.

Салдаты організоўваюць партызанскія атрады

БЭЙПІН. 1. З розных раёнаў паступаюць зьвесткі аб салдацкіх мецяжох і паўстаньнях у раёне Баргі (на заходняй лініі КУ чыг.) паўстаньне носіць політычны характар. Паўстаўшыя салдаты забіваюць камандзіраў і ідуць у сопкі, ствараючы там партызанскія атрады.

Сушыльня і мялка—вузкае месца

КРУПКІ. У Дубаўскім с-савеце да гэтага часу не разгорнута пачатковая апрацоўка і здача лёну дзяржаве. Як у колгасах, так і ў аднаасобным сэктары непадрыхтаваны поўнасьцю сушыльні і ільнамялкі, па колгасах ня створаны брыгады для апрацоўкі лёну.

С-савет, партыйная і комсамольскія ячэйкі не праводзяць растлумачальнай работы аб 70 проц. здачы ільнавалакна да 10-га сьнежня 1931 г. Колгасы „Чырвоны Бор“, „Залаты рог“, „Пуцілавец“ і „Луч ле…на“ не пачыналі апрацо… лёну. Загатоўчыя організа… бязьдзейнічаюць. Дулаўс… сельпо не стварыла фонду … прэміяваньня ільназдатчык… Разгарнуўшы масава-політ… ную работу, трэба дабіц… каб плян за час месячніку б… выканан на 70 проц., а су… рэчны плян РК КП(б)Б 80 проц.

Дамінікаў Р…

Сыгналы „ЧЗ“ не пачуты

„ЧЗ“ ня раз пісала, што на Полаччыне зрываецца плян мобілізацыі сродкаў. Аднак, сыгналы не пачуты. У раёне прарыў.

Полацкі раён уключыўся ў фінэстафэту. Але як ён выконвае гэту важнейшую гаспадарча-політычную кампанію.

Штаб па правядзеньню фінэстафэты бязьдзейнічае.

Плянавае заданьне па мобілізацыі сродкаў выканана на 34,4 проц., па страхоўцы на 55,5 проц., па самаабкладаньню на 54,3 проц., па рэалізацыі акцый Трактарцэнтру на 46 проц. Распаўсюджваньне пазык абодвых выпускаў ледзь дасягае 46,2 проц. пляну.

Усё гэта — вынік неапэрат… насьці у рабоце фінансавых ор… наў, вынік недаацэнкі справы … білізацыі сродкаў.

Па прыкладу раённых органі… зый бязьдзейнічаюць і сельскія … веты.

Алесаўскі с-савет рэалізаваў … зыкі на 97 р., замест вызнача… плянам 219 р.

Ганебна плятуцца ў хвасьце … некатовыя колгасы. „Новы Мі…“ Руднянскага с-савету. павінен б… унесьці 285 р., а ўнёс 150 … „Чырвоны Маяк“, замест 245 … выплаціў 110 р. „Усходы Лені…“ заплаціў 278 р., а трэба 1945 …

М. Віленскі.

На гэтак трэба працаваць

Комсамольскі колектыў Менскага політэхнікуму сувязі яшчэ нічога не зрабіў па разгортваньню сталінскага паходу. Пытаньне аб сталінскім паходзе было пастаўлена на адным з сходаў, але пасьля сходу ніякай практычнай работы ня разгорнута. У тэхнікуме існуе абязьлічка і ураўнілаўка, як у мэтодах выкладаньня, гэтак і ў стыпэндыі. Заняткі стала не наладжаны, асабліва па спэцыяльна-тэхнічных дысцыплінах. Тэхнічнае навучаньне адсутнічае.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб школе не распрацавана. Ні комсамольцы, ні колектыў, ні прафком, ні масы студэнцтва не прапрацоўвалі гэтых пастаноў.

Вясковы.

Замацаваць рост

Комсамольскі колектыў фабр… „Профінтэрн“ (Віцебск) за апош… час вырас на 250 чал. У больша… ці сваёй—гэта моладзь, нядаў… прыйшоўшая з мястэчак і вёсак, … ючая ня значныя політычныя вед…

Ад гэтуль паўстае важнейш… задача—ахапіць у першую чар… ўсіх гэтых навічкоў політвучобай. З гэтай мэтай на фабрыцы арг… нізаваны 4 політгурткі для комс… мольцаў навічкоў. Аднак, яшчэ на сёньняшні дзень няма належн… га наведваньня політзанятак. Цэхавыя ячэйкі на ўжылі ніякіх зах… даў, каб дабіцца поўнага ахоп… навічкоў вучобай.

С. Гільб…

Адказны рэдактар Л. Перліна.

Увазе сэкратароў колектываў і ячэек ЛКСМБ Менскай організацыі

Нарада сэкратароў камітэтаў, колектываў і ячэек КСМ, якая павінна была адбыцца ўчора, пераносіцца на сёньня — 3 сьнежня, а 8 гадз. увечары, у Доме Навукі і Тэхнікі (пакой адпачынку).

З прычыны асаблівай важнасьці пытаньняў, своечасовая яўка абавязкова.

Сэкратар Менгаркому ЛКСМБ—ЯНКОВІЧ.

Сёньня, а 6-й гадз. увечары адб… дзецца паседжаньне Конфліктнай … місіі Менгаркому ЛКСМБ. Выклікаю… на ўсе т.т., якія маюць конфлікты… справы. Павінны абавязкова зьявіц… сэкратары колектываў, на вучоце к… торых лічацца т. т., якія маюць ко… фліктныя справы.

Старшыня КК МенГК ЛКСМБ—КАНОП…

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.